Ніл Гілевіч

Сказ пра залатое пёрка

Вершы

Маладэчна
2005

www.kamunikat.org

Бібліятэчка часопіса «Куфэрак Віленшчыны»
№ 10

Рэдактар
Міхась Казлоўскі

Мастак
Анатоль Акулік

© Н. Гілевіч, 2005 г.

ЯК ЖА СТАЛАСЯ?

Не паверацъ, напэўна, нашчадкі,
Што такія былі ў нас парадкі,
Што дурнілі нас так верхаводы -
Ненавіснікі нашай свабоды,
Нашай мовы, і кнігі, і песні,
Нашых скарбаў і нашых святынь, -
Усяго, што мы ў душах пранеслі
Праз стагоддзяў смяротную стынь.

Як жа сталася, як гэта выйшла,
Што пад выжлаю шчэрыцца выжла,
А пад быдлам скаціціца быдла,
А пад хлусам крыўляецца хлус,
А пад злодзеем хмыліцца злодзей,
А пад лёкаем мыліцца лёкай,
А пад гнусам капогаыцца гнус,
А пад гэтым усім - беларус?
2002

www.kamunikat.org

А ПАВІННЫ, А МУСІМ ...

Беларускую справу
Трэба, хлопцы, рабіць
Не цяп-ляп, а на славу.
Справу трэба любіць!

Цяпам-ляпам, паспешна,
Мы і цэлым гуртом
Не збудуем належна.
Беларускі наш дом.

А павінны ж, а мусім
Так яго збудаваць,
Каб майстроў Беларусі
Свет з'язджаўся вітаць.

А павінны, а мусім
Так свой гонар явіць -
Каб у дом Беларусі
Бог зайшоў блаславіць.
2002

ПАЧУЙЦЕ!

Магчыма, і гэты мой кліч
Далёка не дойдзе: заглохне
У нетрах муроў-камяніц,
У зараслях чортапалоху.

Магчыма... І ўсё-ткі, і ўсё ж:
- Пачуйце! Пачуйце! - гукаю. -
Імперцы прыставілі нож
Да горла няшчаснага краю!

Пачуйце ж, о дзеці зямлі,
Што ваша павек, і не дайце,
Не дайце, каб род наш звялі
Антыхрысты і запраданцы!
2002

www.kamunikat.org

АДНАМУ З НІЦЫХ

Чаму ты радуешся, ніцы раб?
І што жабрачым пафасам вітаеш?
Пагібелі сваёй дзяржавы рад?
На згубу Бацькаўшчыны гімн складаеш ?

Які ж ты ўсё-такі са смердаў смерд
І з халуёў халуй! Якая ганьба!
У тых, што гоняць Беларусь на смерць -
Плюгавы, да агіды, памагайла!

Знай, лёкай, рады хамуту-ярму:
Я прозвішча тваё з радзімых гукаў
Не называю тут адно таму,
Што мне шкада тваіх дзяцей і ўнукаў.
2002

ПРАКЛЁН

Будзьце пракляты вы, каты свабоды!
Вы, што душылі і душыце нас!
Вы, акупатары нашай гасподы,
Нашых багаццяў і нашых украс!

Будзьце пракляты і вы, запраданцы,
Лёсам народу майго гандляры!
Юдавы выблядкі і ўзгадаванцы!
Брудных і блудных таргоў махляры!

Будзьце пракляты і вы, вырачэнцы
Мовы і духу бацькоўскай зямлі!
Вы, надзіманыя пыхай нікчэмцы,
Волі і хэнці чужой халуі!

Гэта з крыжа я крычу вам, распяты
Горам народа і болем маім.
Будзьце пракляты вы! Будзьце пракляты!
Сёння і заўтра й вавекі! Амін!
2002

www.kamunikat.org

БАЛАДА ПРА ПАСЛАННЕ АД КАСТУСЯ

Чакалі год, чакалі два -
На абяцанках трын-трава.
Чакалі тры гады, чатыры -
Да торбы торбу прычапілі.
Чакалі пяць, чакалі шэсць -
Ужо смыліць, курыцца шэрсць.
Чакалі сем, чакалі восем -
Ужо на латах латы носім..."

Так плача й плача Беларусь,
І гэты плач пачуў Кастусь
І ў Божы Храм ва ўрочны час
Прыслаў з архангелам наказ:

"Канчайце хныкаць, дзецюкі!
Калі вам здзек і глум такі
Не пранізаў душу наскрозь
За гэтых восем год - дык вось:
І дзевяць-дзесяць праміне,
І дваццаць-трыццаць праміне -
І ўсе вы дойдзеце ў ярме
І згасне долі вашай зніч, -
Калі забудзеце мяне
І мой з-пад шыбеніцы кліч".
2002-2003

ДЫК ХТО МЫ?

Мова! Ёй роўных у свеце няма -
Па вобразнасці, па выразнасці.
А мы яе душым у клешчах ярма -
Самі ж, па праву уласнасці.

Самі ж, варожы каб цешыўся зброд,
На страты ідзем незваротныя.
Дык хто мы: вялікі і вольны народ
Ці ў Бога нікчэмцы звыродныя?
2003

www.kamunikat.org

ЗАПОЗНА, ПАНОВЕ...

Як ні прамоўлю - усё неўпапад,
Ды так, што ад злосці жыгаламі пораць:
Справа - нястомны саліст "дэмакрат",
Злева - стагорлы "славянасаборац".

Аж дзіўна - як дружна!
Аднак жа - за што?
Люблю сугалоссе, спакой і свабоду.
З-за чорных шор і карычневых штор
На свет і людзей не глядзеў ад роду.

Ні ў форме палкоўнік,
Ні ў штацкім маёр
Мяне на кручку не трымаў пакрыёма.
І хоць у пакутах сумленне маё -
Мне ніцая радасць раба не знаёма.

Таму і вар'юе іх вольны мой кліч
У матчынай мове, не здадзенай гэрцам.
"І ты, галяпуюць, прадайся і ўкленч!
І ты адрачыся і стань зняверцам!"

Дарма - галяпуюць.
І пораць - дарма.

Запозна: мяне ўжо дастаць немагчыма
Я - там ужо, там, дзе няволі няма,
Дзе толькі свабода, любоў і Айчына.
2003, люты

www.kamunikat.org

БАЛАДА ПРА МІКАЛАЯ І КАЦЯРЫНУ

Жыў-быў на свеце Мікалай.
Жыла-была з ім Кацярына.
Хоць бачылі: жыццё - не рай,
Свой лёс сям'я не мацярыла.

Бо зналі: ёсць Народ і Край,
І ёсць - чым доля надарыла:
У Мікалаі - Мікалай,
А ў Кацярыне - Кацярына.

Але жыццё дало разлом
На неспадзеўным развароце.
Размежаваць дабро і зло
Прадыктавала ... дзірка ў роце.

І людзі ў злосці пачалі
Бурыць, ламаць, таптаць і бэсціць
Усё, што самі ж падвялі
Пад кодэкс праў і кодэкс чэсці.

Бурылі, верачы найперш,
Што здань руйнуецца былая.
А зруйнавалі ўрэшце рэшт
У Мікалаі - Мікалая.

Тапталі, мялі, як трысцё,
Сляпую шкодную дактрыну.
А растапталі перш за ўсё
У Кацярыне - Кацярыну.
2003, сакавік

www.kamunikat.org

ДУХ БАЦЬКАЎШЧЫНЫ

Адкуль бярэцца ён? З травы і зёлак,
З лясоў, што засланяюць небасхіл,
З крыніц бруістых, з тоняў у азёрах,
З крыжоў збуцьвелых і з саміх магіл.

Куды ні ступіш - скрозь і ўсюды чутна
Яго ўсяіснасць. Так задумаў Бог -
Каб, як бы ні было табе пакутна,
Свой родны край ты разлюбіць не змог.
2002-2003

* * *

І б'е, і б'е ў душу
Нязмоўчна, як прыбой:
Не будзь самім сабой!
Не будзь самім сабой!

Аддай імя спярша,
А з імем - і душу.
Нашто табе душа?
Нашто табе імя?

Мы ўпішам нумарок -
І ў пашпарт, і ў дьгалом,
І ў візу на Парыж...
І на магільны крыж.
2003

www.kamunikat.org

НЕЧУВАНАЯ Ў СВЕЦЕ

Удумайся толькі, Народ,
Калі думаць яшчэ не адвык:
Сем дзесяткаў гадоў і год
Вырывалі ў цябе язык -
Каб ты быў бязмоўны, як быдла,
Каб толькі мычаў - як бытта
Дзякуеш гаспадару за корм,
За чалавечны для быдла закон.

Сем дзесяткаў! Гэта без тых
Трох з палавінай вякоў,
Калі Мове тваёй пад дых
Білі з абодвух бакоў.

Сем дзесяткаў гадоў і год
Гэта толькі ад той пары,
Калі Мову гналі на звод
Не цары, а правадыры.
Пачуўшы - тут жа хапалі
За горла жывое слова.
Насмерць яго забівалі,
Каб не ўзрасло нанова.
Хапалі з хаты і з нівы -
Каб быў ты кругом шчаслівы,
Хапалі з завода, з цэху -
Каб быў ты багат на ўцеху,
З тэатра, з друкарні, з майстэрні -
Каб ты быў, як сабака, верны,
І з кожнай студэнцкай парты -
Каб быў Ацечаства варты...

Вось так тваю долю-мову
Знішчалі: спярша - па слову,
Затым - па пяць-шэсць адразу,
Затым - па цэламу сказу,
Па цэлай песні і казцы
Хапаў і глытаў ікласты!
А потым - па цэлай школе,
Па цэлым садку дзіцячым...
"Каб ты і не гаўкнуў болей
Сваім языком сабачым!!"
Такі быў табе прысуд.
Халэмус! Каюк! Капут!

Так святкавала ўбоства
Мовы тваёй забойства.
Так апаганьваў злыдзень
Духу твайго Вялікдзень.
Так пацяшаўся зброд
З гора твайго, Народ.

www.kamunikat.org

Прабег і яшчэ дзесятак
Гадоў - як па градах статак.
І што ты, Народзе, маеш?
Як ты жывеш-пажываеш?
На якога пана ішачыш?
Што чуеш наўкол і бачыш?
Таксама святкуе ўбоства
Высокай красы забойства.
Таксама руйнуюць хамы
Твайго дзеяслова храмы.
Таксама глуміцца зброд
З пакутаў тваіх, Народ.

Усё, як тады! Бо згодна
З усім, што табе прывычна.
Толькі яшчэ больш подла
І ягачэ больш цынічна.
Ціха (каб спалі дзеці),
Без груку і некрывава
Ідзе нечуваная ў свеце
Над мовай тваёй расправа.

Над тваёю душой расправа.
2003

ХРОНІКА Ў ГЕКЗАМЕТРАХ

Так, гэта будуць гекзаметры трэцяга
тысячагоддзя
Ад нараджэння Хрыстовага.
Не ў перайманне, вядома,
Слыннаму старцу сляпому Гамеру
або Гесіёду, -
Проста радкі так пабеглі, маёй не
пытаючы згоды.

"Бацька дачушку знасільнічаў -
працверазеў і ўтапіўся ".
"Пенсіянер паляцеў на асфальт праз
акно - ад галечы ".
"Школьніца нож у сяброўку загнала
за трыццаць даляраў ".
"Дачнік спусціў ваўкадава на
хлопчыка - сына суседзяў ".
"Стрэлам у скронь разлічыўся з
жыццём капітан - у адчаі".
"Маці-падлетак, радзіўшы, на сметнік
занесла дзіцятка ".
"Любы, адзіненькі ўнучак бабулю
забіў за бутэльку ".
"Трое юнцоў акадэміку знанаму

www.kamunikat.org

чэрап прабілі".
"Гэтай зімою апошняя здохла
ў калгасе карова ".
"Дзеткі на вуліцы вучацца -
злыдні ліцэй адабралі".
"Піскнула праўду газета - і клямка ёй:
болей не пісне ".

Гэта - маленькая частачка хронікі
ў допісах прэсы.
Наша рэальнасць. На стыку стагоддзяў
і тысячагоддзяў
Іншай не здолелі мы забяспечыцца -
цешымся гэтай.
Іншая спее ў яшчэ не набухлых
пупышках свабоды.
2003

ПАМЯТКА ДЛЯ БЕЛАРУСКІХ ДЗЕТАК

Памятку гэту, гекзаметра складам
антычна-раскошным,
Вам я на роздум і ўжытак пішу,
даражэнькія дзеткі.
Ведайце: шмат развялося людцоў на
зямлі беларускай,
Што нашу мову драпежаць і нас за
яе ненавідзяць.
"Ну, а чаму?"- запытаеце? Дзве
назаву я прычыны:

Першая - гэта іх чорная і
неадольная зайздрасць,
Што незвычайна прыгожаю моваю
Бог надзяліў нас -
Наймілагучнай, найчыстай у
моўным букеце славянства.
Спевам анёльскім чароўным гучыць
яна ў вусенках вашых,
Як запяеце вы, дзетачкі, родную
песню... Дык вось жа -
Іх і даймае нялюдская зайздрасць,
не могуць змірыцца:
Як гэта нам дасталася такая

www.kamunikat.org

цудоўная мова ?!
Ну, а другая прычына, што многіх
кідае ў шаленства,
Гэта - іх злосць ад бяссілля,
ад немачы розуму й духу:
Надта ж багатая і дасканалая
ў гуках і ў сэнсах
Наша вячыстая мова!
Каб ёю як след авалодаць -
Розум патрэбен не куцы,
і талент, і чуйнае вуха.
Слабым глуздамі няздарам яна
недаступная, - гэтак,
Як не па сіле складаны і тонкі
інструмант музыку,
Што балдавешкаю бухае-б 'е
ў барабан велічэзны...
Вось і запомніце, дзеткі,
і ведайце-знайце прычыны
Злосці-нянавісці гэтых няшчасных...
І дзякуйце Богу,
З ласкі якога мы ўласную маем
Краіну і Мову.
Ну і рабіце высновы. Якія ?
Падумайце самі.
2003

* * *

Ведаў: будзеце зноў і хлусіць,
І віляць перад праведным словам,
А я зноў буду Бога прасіць,
Каб яно на здароўе пайшло вам.

Разумею ваш клопат, браткі, -
Разумею і крыўды не маю:
Гэта лёс, гэта вырак такі -
Мой, і ваш, і няшчаснага краю.
2003-2004

www.kamunikat.org

ОЙ, ЯК ДОБРА!

Добра ў зацішку, на сонейку
Пасядзець. Ой, як добра!
На істот жывых спакойненька
Паглядзець. Надта добра!
На казюлечку-мурашачку
У траве. Ой, як добра!
Вунь як рада малюпашачка,
Што жыве! Як ёй добра!
Паглядзець на гулі шлюбныя
Матылькоў. Надта добра!
Сэнс жыцця - у гэтым, любыя.
З век вякоў. Ой, як добра!
2004

БАЛАДА ПРА ВАНЬКУ І МАНЬКУ

Ванька і Манька,
Каб не псаваць
Адносін з багатай суседкай,
Рашылі ёй хату сваю аддаць
І жыць у яе пад паветкай.
Ну й ідыёты!

Як жыцьмуць яны там?
Вядомая рэч:
Зімою заенчаць абое:
"А дзе ж наша хатка?
А дзе ж наша печ?
А што ж мы зрабілі з табою?
Ну й ідыёты!"

Пасля акалеюць.
І прыме іх дол.
І крыж ім паставяць з пameткай:
"Ванька і Манька.
Мелі свой дом,
А ўмёрлі ў людзей пад паветкай.
Ну й ідыёты!"
2004

www.kamunikat.org

ПЫТАННЕ

Беларус!
Ты і дужы, і зграбны,
[кемны, і ў працы не зломак.

Дык чаму ж
Ты жывеш, як бяздарны,
Нікчэмны лайдак-пустадомак?

Дзе твой дух?
Дзе твой гонар? Твой голас?
Твой чын беларускі?

Ці ты гакнеш...
Ну хоць кулаком па стале -
Каб на дробныя друзкі!?
2004

ГОСПАДЗЕ БОЖА...

Госпадзе Божа,
Навошта,
Навошта ты ўзяў мяне ў сведкі -
Бачыць, як з роднае Маці
Знушчаюцца вылюдкі-дзеткі?
Як выглумляюцца,
Як ёй у вочы плююць,
Супастаты-блюзнерцы,
Як намагаюцца,
Найбалючэй каб
Ударыць няшчаснай у сэрца...
Госпадзе Божа,
За што мне,
За што мне такая пакутная кара -
Каб адыходзіў я
З гэтага свету
Пад гогат агідных пачвараў?
Хай бы я лепей
Не чуў і не бачыў,
Не знаў і не ведаў такога!
Хай бы Ты лепей
Забраў да сябе мяне, Божа,
З калыскі - малога.
2004, травень

www.kamunikat.org

МАЕ САБАЧКІ

Восем іх у мяне - аж восем! -
Розных парод і масцей сабачых:
Чорны, жоўты, руды і перапалосы,
І нават якіх я ў натуры не бачыў -
Якісь кармазынавы і фіялетавы,
І светлаблакітны, як неба ў сонцы...

Хто яны ў хаце? Сябры паэтавы,
Заступнікі верныя і абаронцы.

Вунь які ў кожнага від харобры -
Ні ў аднаго не падтулены хвосцік.
І крый Бог, калі нехта нядобры
У масцы добрага прыйдзе ў госці!

"А ну паспрабуй зачапі перад намі
Не толькі словам, а й думкамі брыдкімі -
Дык пабяжыш з раскалашмачанымі штанамі
І з пакусанымі лыткамі!"

Дзякую, дзякуй, мас дарагія,
За вашу гатоўнасць кінуцца й абараніць,
Калі раптам нейкія людзі благія
Захочуць мне крыгуду ўчыніць.

Як гэта важна ў мой час невясёлы!
І як жа я ўдзячны мілай малечы -
Трэцякласнікам лепшае мінскай школы.
Што мне падарылі вас на сустрэчы!
2004, красавік

www.kamunikat.org

СКАЗ ПРА
ЗАЛАТОЕ ПЁРКА

Як матульку немаўлём
Меў за Матку Боску -
Я смактаў і ўноч і днём
Залатую соску.

Падкачаўшыся крыху,
Часта і ў ахвотку
Еў ільняную жмыху
З залатога сподку.

Як давер бацькоў зазнаў -
Хоць малы, а служка!
Парасят на выган гнаў
Залатою пужкай.

Стаў падлеткам - на мурог
Пасвіць вёў Буронку
На прывязаным да рог
Залатым пастронку.

Потым... неяк на жніве
Птушка перапёлка
Падарытла ў жыце мне
Залатое пёрка.

Хай не з неба журавель -
"Жнеячка" затое.
Я ад шчасця ружавеў:
Пёрка залатое!

Любаваўся доўга ім
Дый схаваў чын-чынам:
Рана знацца мне з такім
Залатым начыннем.

Як, пажыўшы, награшу -
Вось тады, канешна,
Выму пёрка й напішу
Залатое нешта.

Жыў, грашыў і гараваў,
Піў і плакаў горка.
Дый забыўся дзе схаваў
Залатое пёрка.

Сама ў час, адчуў калі,
Што душа гатова
Падарыць сваёй зямлі
Залатое слова.

www.kamunikat.org

Ну, ды што ж! Такой бяды!
Гэты дар у вершах
Зробіць нехта малады -
З племя шчаслівейшых.

Тое пёрка ў добры час
Знойдзе ў нейкім склепе
І напіша Слова-Сказ
Прыгажэй і лепей.
2003-2004

ЭКСПРОМТ

Калі дапякуць, што ні есца, ні п'ецца
І нават на сэрцы аскоміна -
Я еду зірнуць, як дымочак віецца.
Не, не, не шашлычны, а з коміна.

А потым агмень распалю на падворку,
З каменння Лагойшчыны складзены,
І буду там з полымцам весці гаворку
Пра лёс наш, чужынцамі скрадзены.
2002

www.kamunikat.org

КЛІЧ
ДА БЕЛАРУСКАЙ МОЛАДЗІ

Новы век
Азарыў небасхіл.
"Чый ён будзе?" -
Прарокі гамоняць.
Будзе наш -
Калі выстарчыць сіл
У цябе,
Беларуская моладзь!

Значыць,
Трэба па долю ісці
З цвёрдай верай,
Што вёрсты не зморацъ.
Дык не страць,
Не ўступі,
Не ўпусці,
Гэты шанц,
Беларуская моладзь!

Хай за зданню
Пачварыцца здань
Сілу волата
Ці не зломяць.
Час прабіў:
Уздыміся
І стань
У шыхты,
Беларуская моладзь!

Веру:
Выпаўзні з чорнай начы
Дух твой вольны
На здраду не змовяць.
Раздрузгоч,
Раскрышы
І змяці
Іх кубло,
Беларуская моладзь!

Помні:
Волю ў змаганні бяруць,
А не просяць,
Не кленчаць,
Не моляць.
Толькі ты
Зберажэш Беларусь!
Толькі ты,
Беларуская моладзь!
2001

www.kamunikat.org

БЕЛАРУСКАМ У ДЗЕЦЮКУ

Што дрыпаеш гэтак дробна
На падагнутых нагах?
Роўна хадзі, брат, роўна!
І кроку прыдай размах!
Шырока ступай і цвёрда!
Паставу ў хадзе змяні!
Годна трымайся й горда!
Ты - на сваёй зямлі.

Што ты пагляд панылы
Пад ногі ўпіраеш, у дол?
Што: табе - край нямілы?
Родны прастор наўкол?
Смела, а не як злодзей.
На свет і людзей зірні!
Годзе трымцець, брат, годзе!
Ты - на сваёй зямлі.

Што ты ўсё шэптам, шэптам
Ды і на вуха яшчэ,
Нібы махляр з гешэфтам:
Крый Бог - сакрэт "працячэ".
Прэч адкінь гэту боязь!
І праўду перад людзьмі
Кажы, брат, на поўны голас!
Ты - на сваёй зямлі.
2005, чэрвень

www.kamunikat.org

З ВЕКУ Ў ВЕК І З РОДУ Ў РОД

З веку ў век і з роду ў род
Не цярпеў ярма народ
І глядзець чужынцу ў рот -
Меў за ганьбу.
І над безліччу нягод,
І над скопішчам згрызот
Бласлаўляў на Вольны Сход
Янку й Ганну.

З веку ў век і з роду ў род,
Сэрцам прагнучы яснот,
Не глуміў сябе народ
Чорнай змовай
І ля тых дзвярэй-варот,
Дзе ў Святыню Уваход,
Меў за варту круглы год
Наша слова.

І грымеў мацней грымот
Кліч на захад і на ўсход:
Згінь-сыдзі, варожы зброд!
Каб - ні духу!
Не затым ускрэс народ,
Каб давеку, з роду ў род,
Несці ў сэрцы гвалту плод -
Боль і скруху!
2005, чэрвень

www.kamunikat.org

ПЕРАМОЎКА З СЯСТРОЙ СВЯТЛАНАЙ

- Сястрыца любая,
Ты што з слязьмі ў вачах ?
Што сталася ?
Цябе пакрыўдзіў хтосьці ?
- Вось, прачытала...
Гэта - страх і жах.
Яны, браток,
Цябе даб'юць ад злосці.

- Дык ты з-за гэтага ?
Дарма, зусім дарма!
Тут не тужыць,
А радавацца трэба.
Злуюцца - значыць,
Праўды ў іх няма.
А страх і жах -
У іх сядзіць у рэбрах.

- Мне за цябе
Сціскае сэрца боль.
Лютуюць,
Што не стаў ты на каленкі.
Пайду, пайду ў той дом -
Адно дазволь -
І хоць катораму з іх
Плюну ў зенкі!

- Ах, мілая!
Ну як мне не любіць
Цябе! У нашым
Немаленькім родзе -
Адна такая ты.
За ўсіх табе баліць
І ўсім ты рвешся
Памагчы ў нягодзе.

Ну а сама...
Тваё здароўе скраў
Пеніцылінавы
За трыццаць год атруты.
І мацярынскай долі
Бог не даў.
І дома... Знаў бы хто!..
Адны пакуты...

- Такі мой лёс.
Што пра мяне казаць?
Хто я такая ?
Што ў жыцці я значу ?..

www.kamunikat.org

Вось тыя лекі,
Што прасіў ты ўзяць.
І мёд з вашчынкай -
Ад мяне ў прыдачу.

І ўсё.
Пакіну я цябе, прабач.
Жанчыны там з партрэтамі -
Як знак эпохі -
Стаяць... Я чую
Іх нячутны плач.
Пайду да іх
Паплачу разам трохі.
2005, чэрвень

НУ А ВЫ, СПАДАРЫ?..

Углядаюся ў твары -
Зусім маладыя, хлапечыя, -
Быццам толькі што ўмытыя
Зімнай крынічнай вадой.
Што - хачу распазнаць -
У вачах гэтых хлопцаў
Адсвечвае?
І чаму мне трывожна -
Нібы перад нейкай
Вялікай бядой?
Ну а вы, спадары,
Што душы нашай поле
Адвечнае
Засяваеце чартапалохам
Няпраўды,
Каб плён нашай веры зачах, —
Вы не знаеце,
Што ў іх вачах беларускіх
Адсвечвае ?
У іх добрых вачах беларускіх.
У іх беларускіх вачах...
2005, чэрвень

www.kamunikat.org

ВІЛЬНЯ. ЛУЦКЕВІЧ

Трыпціх

I. 20 верасня 1939

Вільня.
Восень.
Луцкевіч.
Ён ходзіць і шэпча
Сярод Базыльянскіх муроў:
"О няўжо, Беларусь,
О няўжо нам вяртаюць
Калыску за волю тваю змагароў?
О няўжо сапраўды
Нам вяртаюць,
Няхай і пад сцягам нянаскім,
Святы наш агмень?
Беларусь!
Я малюся, малюся...
Бог сведка,
Як прагну я ўбачыць шчаслівым
Твой заўтрашні дзень!.."

II. 30 верасня 1939

Вільня,
Восень.
Луцкевіч.
Захмараны вечар.
Найчорны з яго вечароў.
Вось і ўсё!
Не паспеў і прыкленчыць
Яшчэ раз
Сярод Базыльянскіх муроў, -
Больш ніколі не ўбачыць ён іх,
Як не ўбачыць
Ні родных сваіх,
Ні сяброў.

У глухім "варанку"
Яго віленскім шляхам
У менскую "амэрыканку" вязуць,
Дзе,
Ён знае,
У лёхах сырых,
Пацукі
Беларускае сэрца грызуць.
Яму ведама ўжо:
Абманулі!

www.kamunikat.org

Цынічна і здзекліва
Брат-вызваленец накпіў.
Вільня ўжо старгавана.
Ужо за яе
Вызваленец
Пляцоўку для танкаў купіў.

Ён ад роспачы плача: "Кастусь!
Наш вялікі з вялікіх Кастусь!
Як далёка ты бачыў, калі заклінаў:
"Дык не вер ім,
Не вер Ім,
Не вер ім,
Не вер, Беларусь!
Не дадуць табе волі яны,
Не дадуць!
І павек не дажджэшся,
Калі не здабудзеш сама!
Для цябе ў іх адно -
Аняменне ў няволі -
І смерць.
Для цябе ў іх другога няма".

III. 17 верасня 2004

Вільня.
Верасень.
Ноч -
У зіхценні раскошных рэклам,
У агнях ліхтароў.
Цень Луцкевіча
Ходзіць
Нябачны
Сярод Базыльянскіх муроў.
Каб прыслухаўся хто -
Чуйным сэрцам -
Пачуў бы,
Што кажа святы чалавек:
"Вось і ўсё!
Вось цяпер ужо ўсё!
Назаўсёды.
Навечна.
Навек.
Божа моцны!
Даруй і скажы:
Дзе ты быў?
Дзе ты, Госпадзе, быў,
Калі гэную змусту
Над воляй,

www.kamunikat.org

Над доляй,
Над лёсам народа рабіў
Змеявокі,
Рабы,
Сухарукі,
З смярдзючай душышчай
Вампір-людажэр?

Бачыш, Госпадзе, сам:
З той пары
Яшчэ больш занямог,
Яшчэ больш знедужэў -
І хварэе,
І чахне,
І не выздараўлівае
Пад апекай тваёй
Беларускі народ.
Дык не дай жа, не дай,
Каб заціх у душы яго
Спадчынны боль,
Каб сышла яго памяць на звод!
Бо як станецца так –
У яго, як і Вільню,
Суседзі, браты, сваякі адбяруць
Спрэс усе гарады,
Спрэс усё,
Што завецца яшчэ Беларусь!..
Беларусь...
Беларусь..."

Так ён ходзіць і ходзіць,
Нябачны,
І просіць і просіць -
Нячутнае просіць пачуць...
А тым часам у Менску,
У лёхах сырых.
Пацукі
Беларускае сэрца грызуць.
2004, травень-кастрычнік

www.kamunikat.org

ЛАГОЙШЧЫНА

Лірычны маналог

Лагойшчына!
Найпрыгажэйшы куток беларускай зямлі!
І хоць, пэўна, за гэтую славу
гатовы спрачацца і многія іншыя
з тых, што на ўсход і на захад,
на поўнач і поўдзень,
ды невыпадкова, аднак жа,
цябе "беларускай Швейцарыяй"
трапна калісьці назвалі -
таму ўжо за сотню гадоў
і дагэтуль без рэўнасці ўсе аўтараюць
як вобраз дакладны і ўдалы.

Ты ўся - у пагорках паднебна-высозных,
крутых і пакатых, лабастых і круглых,
зарослых і голых,
ва ўпадзінах донных і ўтульных лагчынах,
у поймах разлеглых, усланых лугамі,
у стромых узгор'ях, равах і ярах маляўнічых,
у луках і лучках, абшытых гсустоўем густым,
у белых прасёлках - ад вёскі да вёскі
(што праўда - у тым, пешаходным яшчэ,
даасфальтавым часе).

Ты ўся - у лясах неаглядных,
у пушчах дрымучых, таемных,
у шчырых барах і цяністых дубровах,
у ясных і ветлых палянах,
уся ў паясах і вянках пералескаў,
у купках гаёў кучаравых,
у люстрах лясных азярын
і люстэрках крынічак,
калісьці нязлічаных тут,
што вечна бруіліся, булькалі,
беглі, журчалі,
як бы запрашалі
прыпасці губамі ці ў горшчы зачэрпнуць
і смагу ўталіць і здароўя набрацца.

А рэкі твае! - ціхаплынная,
негаманкая, апроч як разводдзем,
спаважная Гайна,
што згодна і любасна
Беразіне ахвяруе сябе,
каб урэшце дабегчы нябачным струменем
да Чорнага мора,
а вечная-звеку суперніца ёй -
Дзвінаса-прыгажуня,

www.kamunikat.org

што з бегу-разбегу кідаецца,
нібы сястра, у абдымкі Віллі,
каб данесці пяшчоту сваю
да балтыйскіх прастораў.

А горад твой! - горад Лагойск -
легендарны ў гісторыі краю
крывіцка-ліцвінскага, -
потым, пазней, беларускім названага!
Мала на нашай зямлі гарадоў,
што старэйшыя ўзростам
за колішні слынны Лагожэск -
сталіцу удзельнага княства,
няхай невялікага і падзалежнага,
важна, што ўсё ж адасобнага,
што на зямлі гэтай людзі
дзяржаўнымі чуліся
недзе яшчэ ў адзінаццатым веку.
Невыпадкова, што іменна тут,
у набожлівай Гайне, у храме,
за дзесяць гадоў перад тым збудаваным,
спраўлялі імшу каралю і вялікаму князю
у гонар яго ваяроў неадольных
і іх перамогі,
якою былі ўратаваны ад чорнай няволі
і Віцебск, і Полацк, і Орша,
і Крычаў, і Мсціслаў і многа яшчэ
гарадоў і зямель і людзей крывічанскіх,
падданых магутнай і знанай у свеце дзяржавы -
Вялікага Княства.

Лагойшчына!
Колькі тваімі гасцінцамі ды бальшакамі,
дарогамі ды пуцявінамі
люду прайшло і праехала рознага -
болей нядобрага, жорсткага,
лютага, сквапнага!
Колькі крыві пралівалася тут
і палала пажараў бязлітасных,
колькі паселішчаў, вёсак тваіх руйнавалася,
колькі святыняў бурылася -
цэркваў, касцёлаў і кляштараў,
колькі палацаў-муроў і сядзібаў
знікала бясследна! -
а ты - адраджалася,
ты паўставала ізноў
да жыцця і свабоды.
Невыпадкова,
што з гэтаю марай святлістай
аб волі і шчасці, аб славе і годнасці
тут азараліся сонцам навукі,
асветы, мастацтва

www.kamunikat.org

выдатныя творцы,
збіральнікі скарбаў народных,
даследчыкі даўнасці,
што менавіта ў Лагойску
патомныя графы Тышкевічы
ў белым палацы сваім
па-над Гайнай-ракой
заснавалі найпершы ў дзяржаве
музей краязнаўства,
музей беларускай культуры,
мастацтва і кнігі.
І не выпадкова ж, напэўна,
што іменна тут,
ад калыскі прыросшы душою
да родных нябёсаў,
"наўчыўшыся слоў беларускіх ад маці,
а дум беларускіх
ад потам палітых загонаў",
штодня амываючы раны на сэрцы
вадой жыватворнай легендаў і песень,
паданняў і казак,
паўстаў найвялікшы пясняр беларускі,
апостал-прарок адраджэння Народа,
Краіны Дзяржавы і Гонару нашага -
Янка Купала.

Лагойшчына!
Родны мой кут, дзе радзіўся і вырас
і першую ласку людскую спазнаў
і прыняў як навек блаславенне,
дзе хата бацькоўская светам была наймшейшым
і памяпцю найдаражэйшаю будзе да смерці,
дзе родныя сэрцу абліччы на помнічках сціплых
часцей і часцей патрабуюць:
трымайся! не падай!
не траць у віхуры нягодаў
той сілы і праўды, любові і веры,
якімі сумленна і проста жылі мы,
пра гэта амаль не гаворачы,
мужна і годна прайдзі да астатку
дарогу, якую ты выбраў,
і помні, і помні, і помні:
не можа той чуцца няшчасным,
хто мае такую радзіму,
як наша Лагойшчына!

2002, ліпень - 2003, сакавік

www.kamunikat.org

З М Е С Т

ЯК ЖА СТАЛАСЯ? 5
А ПАВІННЫ, А МУСІМ 6
ПАЧУЙЦЕ! 7
АДНАМУ З НІЦЫХ 8
ПРАКЛЁН 9
БАЛАДА ПРА ПАСЛАННЕ АД КАСТУСЯ 10
ДЫК ХТО МЫ? 12
ЗАПОЗНА, ПАНОВЕ 13
БАЛАДА ПРА МІКАЛАЯ І КАЦЯРЫНУ 15
ДУХ БАЦЬКАЎШЧЫНЫ 17
"І Б'Е, І Б'Е Ў ДУШУ..." 18
НЕЧУВАНАЯ Ў СВЕЦЕ 19
ХРОНІКА Ў ГЕКЗАМЕТРАХ 23
ПАМЯТКА ПРА БЕЛАРУСКІХ ДЗЕТАК 25
"ВЕДАЎ: БУДЗЕЦЕ ЗНОЎ І ХЛУСІЦЬ..." 28
ОЙ, ЯК ДОБРА! 29
БАЛАДА ПРА ВАНЬКУ І МАНЬКУ 30
ПЫТАННЕ 31
ГОСПАДЗЕ БОЖА 32
МАЕ САБАЧКІ 34
СКАЗ ПРА ЗАЛЛТОЕ ПЁРКА 36
ЭКСПРОМТ 39
КЛІЧ ДА БЕЛАРУСКАЙ МОЛАДЗІ 40
БЕЛАРУСКАМУ ДЗЕЦЮКУ 41
З ВЕКУ Ў ВЕК І З РОДУ Ў РОД 43
ПЕРАМОЎКА З СЯСТРОЙ СВЯТЛАНАЙ 45
НУ А ВЫ, СПАДАРЫ? 48
ВІЛЬНЯ. ЛУЦКЕВІЧ 49
ЛАГОЙШЧЫНА 55

Ніл Гілевіч
СКАЗ ПРА ЗАЛАТОЕ ПЁРКА
Набор Валянцін ЦІШКА
Вёрстка Алесь КАПУЦКІ
Вокладка: Валннціна ТРАЦЯК,
Сяргей ПРЫШЧЭПАЎ
Выданню кнігі паспрыяла грамадзянская
ініцыятыва «КРОСНЫ»

Новую кнігу паэзіі Ніла Гілевіча "Сказ пра залатое пёрка" складае грамадзянская лірыка чатырох апошніх гадоў (2001 -2004). Усе вершы ў ёй - пра тое галоўнае, што было і ёсць найпершым клопатам і найвялікшым болем паэта: лёс Бацькаўшчыны і роднае слова.

Наклад 200 экз.

© OCR: Камунікат.org, 2010 год
© Інтэрнэт-версія: Камунікат.org, 2010 год
© PDF: Камунікат.org, 2010 год

www.kamunikat.org